View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**Заяц Н.В. (Мінск)**

**Дыхатамія «высокае – нізкае» ў лірыцы «Вянка»**

У мастацкай сістэме «Вянка» М. Багдановіча актуалізуецца і атрымлівае арыгінальную інтэрпрэтацыю такая ўніверсальная дыхатамія, як «высокае – нізкае». Традыцыйна многія з падобных архетыпічных апазіцый («светлае – цёмнае», «белае – чорнае», «жывое – мёртвае», «прыгожае – агіднае» і інш.) вызначаюцца ацэначнасцю, першы іх складнік звычайна звязваецца з пазітывам, станоўчым полюсам, другі – з негатывам, адмоўным. У М. Багдановіча функцыянальнае прызначэнне названых палярных катэгорый не зводзіцца да ацэнкі, заснаванай на іх кантрасце, а падпарадкоўваецца больш складанай мастацкай задачы. Часткі дыхатаміі ў паэтычным радку ўзаемадапаўняюць адна другую, выступаюць у непарыўным адзінстве: «нізкае» дапамагае падкрэсліць, заўважыць «высокае», з’яўляецца неабходнай умовай для яго існавання. Так, дэтэрмінаванасць першага кампанента архетыпічнай апазіцыі другім асабліва яскрава выяўляецца ў вершы «Гутарка з паненкамі» (цыкл «Вольныя думы»): «“Прабачце! Ластаўка малая / Для птушанят гняздо зрабіла / І клапатліва ўкруг лятае, – / Аж паглядзець прыемна-міла!” / “Вельмі чароўныя паненкі! / Тут ёсць напэўна трохі цуду: / Ў гняздзечку міленькім і сценкі / І дно яна зляпіла з бруду”» [1, с. 128]. Суразмоўцы лірычнага героя захопленыя знешняй прыгажосцю і дасканаласцю птушынага гнязда, не звяртаюць увагі на тое, з якога матэрыялу яно зроблена. Часткі дыхатаміі, такім чынам, не супрацьпастаўляюцца, а ўзаемаўраўнаважваюцца, узаемаабумоўліваюцца.

Катэгорыя «нізкае» ў М. Багдановіча часта выконвае ролю своеасаблівага каталізатара эстэтычнай каштоўнасці рэчаў, якія самі па сабе не ўспрымаюцца як выключныя, незвычайныя і становяцца такімі толькі ў кантэксце згаданай амбівалентнай пары. Так, чароўныя лілеі ўзгадаваны заплеснявелым балотам, «узор прыгожы пекных зор» выглядае цудоўным і незвычайным менавіта ў адлюстраванні брудных лужын. У гэтай сувязі можна гаварыць пра парныя, дыхатамічныя мастацкія вобразы, ідэйна-сэнсавы змест якіх раскрываецца цэласна – ва ўзаемасувязі і непадзельнасці кожнага з кампанентаў.

Найбольш паслядоўна вобразныя пары сустракаюцца ў вершах нізкі «Вольныя думы» («Мне снілася», «Вы, панове, пазіраеце далёка...», «Вы кажаце мне, што душа у паэта...», інш.) і ў творах «Старой Спадчыны» («Пентаметры», «Рандо», «Актава», інш.). На карысць тэзіса пра першаснасць «нізкага», яго асноватворную ролю ў існаванні «высокага» сведчыць мастацкая рэпрэзентацыя парных вобразаў у «Санеце» («На цёмнай гладзі сонных луж балота...»). Вобразы «лужы балота» – «чашачкі лілей», «плесня, бруд» – «краскі», «гніль» – «цвятоў расістых чыстая краса» ў творы страчваюць першапачаткова антанімічную семантыку. Дзякуючы іх супастаўленню, «высокія» вобразы ўзбуйняюцца, разам з тым, «нізкія» не выглядаюць адназначна агіднымі і непрывабнымі. М. Багдановіч згладжвае закладзеную ў вобразных парах супярэчнасць, эстэтызуе неэстэтычныя з’явы і катэгорыі: «Цяпер давольна топкае багно: / Гніль сотні год збіраючы, яно / Смуроднай жыжкаю узгадавала / Цвятоў расістых чыстую красу» [1, с. 138].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

У «Рандо» («Узор прыгожы пекных зор...») канцэптуальна значнай з’яўляецца вобразная пара «ўзор прыгожы пекных зор» – «гразь луж», супастаўляюцца таксама ўласна ўзор і яго адбітак, арыгінал і «падробка». Даследчыца Т. Чабан трактуе дыхатамію ў сувязі з праблемай мастака і мастацтва і выходзіць на філасофскія пытанні: «Якую красу апявае мастацтва – сапраўдную ці ўяўную, ілюзорную? Ці можа паэт убачыць сапраўдныя зоры і сапраўднае неба і ці можа неба ўчуць яго зямны «крэхат хілы»?» [2, с. 510]. Наватарскім і неардынарным мастацкім прыёмам выглядае пэўнае змяшчэнне акцэнтаў пры інтэрпрэтацыі некаторых традыцыйных вербальных сімвалаў. Так, звычайна ў літаратуры сонца атаясамліваецца з прыгажосцю, віталістычнай сілаю – звязваецца са сферай «высокага». Аднак у рандо яно не толькі не спрыяе выяўленню красы, але і замінае гэтаму: «І гімн спявае жабаў хор / Красе, каторую з’явіла / Гразь луж; напоўніць мгла прастор, / І ўстане з іх гарашчы міла / Узор. / І сонца дальш клянуць, што скрыла / Луж зоры днём» [1, с. 141]. Тут адбываецца своеасаблівая рэабілітацыя «нізкіх» вобразаў, у прыватнасці, жаб. Істотам, што паводле традыцыйных уяўленняў знаходзяцца ці не на самай апошняй прыступцы ў жывёльнай іерархіі, М. Багдановіч дае магчымасць «наблізіцца» да нябёсаў, няхай і ў «гразі луж», але ўбачыць зоры і праспяваць гімн хараству.

У традыцыйным сімвалічна-сэнсавым ключы раскрываецца вобраз сонца ў «Трыялеце» («Калісь глядзеў на сонца я....»), дзе архетыпічная апазіцыя ўвасабляецца ў метафарычнай пары «сонца» – «цемень вечнай ночы». Калі, напрыклад, у вершы «Гутарка з паненкамі» ці ў «Санеце» сутыкненне амбівалентных вобразаў працавала на актуалізацыю таго з іх, што адпавядае катэгорыі «высокае», то тут яно выконвае іншую ролю. Палярныя вобразы закліканы паказаць памежны, раздвоены стан лірычнага героя, які здолеў узняцца над паўсядзённасцю і абывацельствам, жыццёвай руцінаю, аднак, быў выстаўлены на пасмешышча – у вершы даволі адчувальны дэкадэнцкі матыў адзіноты і незразуметасці. Тым не менш герой не адмаўляецца ад свайго ведання пра існаванне іншага, больш дасканалага свету: «Няхай усе з мяне рагочуць, / Адповедзь вось для іх мая: / Калісь глядзеў на сонца я, / Мне сонца асляпіла вочы» [1, с. 140].

Варта падкрэсліць, што ў «Трыялеце» дыхатамія рэалізуецца яшчэ і на жанравым узроўні: паэт напаўняе «нізкую» вершаваную форму «высокім» зместам. Як вядома, у Францыі, а пасля і Расіі ў розныя перыяды гэты жанр выкарыстоўваўся пераважна для перадачы гуллівага і пацяшальнага зместу, належаў да «салонных», забаўляльных і знаходзіўся па-за межамі «якаснай» паэзіі. Звярнуўшыся да трыялета, беларускі аўтар не толькі рэалізаваў асветніцкае жаданне пашырыць ідэйна-зместавыя абсягі пераважна «сялянскай» нацыянальнай паэзіі, паказаць яе багатыя фармальна-выяўленчыя магчымасці, але і разняволіў жанравыя каноны старой вершаванай формы, даў ёй новае жыццё. У дадзеным выпадку «гульнёвая» форма трыялета паслужыла для абазначэння сур’ёзнай, экзістэнцыяльнай праблемы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вынікам роздуму над філасофскімі пытаннямі з'яўляецца таксама верш «Мне снілася». Пры дапамозе мастацкай апазіцыі «высокае – нізкае» тут абазначаецца складаная праблема сапраўднасці / несапраўднасці ідэалаў: «Ўсё вышэй і вышэй я на гору ўзбіраўся, / Падымаўся да сонца, што дае нам цяпло: / Але толькі чым болей да яго набліжаўся, / Тым усё халадней мне й маркотней было» [1, с. 133]. Як і ў «Рандо», канцэптуальны вобраз верша, на гэты раз – сонца, у паэтычным кантэксце набывае сэнсавую бінарнасць і суадносіцца адразу з двума кампанентамі дыхатаміі. Палярнасць, аксюмароннасць вобраза – «халоднасць» сонца – узмацняе думку-адкрыццё пра немагчымасць абсалютных ісцін, пра нежыццёвасць ідэй, што толькі падаюцца значнымі і высокімі, а самі такімі не з'яўляюцца.

На сутыкненні апазіцый пабудаваны верш «Вы, панове, пазіраеце далёка...», у якім знайшлі адлюстраванне народныя ўяўленні пра магчымасць убачыць зоры днём – на дне студні. Кантраснае супастаўленне вобразаў зор і студні, што даўно «счарнела і згнівае» [1, с. 130], аднак, хавае ў сабе цуды прыгажосці, выступае моцным аргументам у палеміцы аўтара з апанентамі: «Вы, панове, пазіраеце далёка / Ў блеску сонца з велізарных плеч народных, / Але святло крые шмат чаго ад вока – / Днём не бачыце Вы зорак пуцяводных» [1, с. 130]. Паэт выступае абаронцам простых людзей, якія належаць да нізоў толькі па сацыяльным статусе, а па маральных якасцях, магчыма, нават і пераўзыходзяць тых, хто стаіць над імі. У гэтым выпадку полюсы ацэначнасці таксама мяняюцца месцамі: звязаны са сферай «нізкага» вобраз народа, загнанага ў «норы падзямельныя», духоўна ўзвышаецца над вобразам прадстаўнікоў высокіх колаў грамадства.

Па вялікім рахунку, уся паэтычная кніга «Вянок» засноўваецца на палярных катэгорыях: «высокае» і «нізкае», «жывое» і «нежывое», «прыгожае» і «агіднае», «мінулае» і «сучаснае», «ідэальнае» і «рэальнае». Вынесеная ў загаловак дыхатамія ўвасабляецца ў сэнсава непадзельных, парных вобразах, суадносных з яе кампанентамі. У кожным канкрэтным выпадку яна выконвае адмысловую мастацкую функцыю і сведчыць пра антынамічнасць, неадназначнасць, глыбіню і ўнікальнасць багдановічаўскай рэцэпцыі свету.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск, 2001. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды.
2. Чабан, Т. Космас «Вянка»: літаратурны каментарый да «Вянка» Максіма Багдановіча / Т. Чабан // Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – Мінск, 2001. – С. 463–518.